Год II. Субота, 29 Студня (января) 1921 г. № 4.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. Цана асоб. нумэру 6 марак. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Наша Бацькаушчына.

Мы народ беларускі і наша бацькаўшчына—Беларусь. Ня ўсе аб гэтым ведаюць. Каталікі называюць сваю веру польскай і сябе польскімі; праваслаўныя думаюць аб сабе, што яны рускай веры і рускімі сябе называюць. Гэтая абмылка доўга яшчэ будзе пакутаваць у нашым краі, аж пакуль народ не прасьвятлее, пакуль не дарасьце наша новая маладая інтэлігенцыя з тых хлапчукоў, што цяпер вучацца па школках. А і цяпер ўжо просты народ даходзіць да розуму і пазнае, што мы Беларусы.

Кожны відзіць, што мы інакшыя ад суседзяў: мы не маскалі, ані палякі, ані ліцьвіны: мы толькі людзі „простыя“, наша гаворка простая, звычаі ня хітрыя, адзежа простая, белая, песьні жалосныя, як і наша гаротная доля. Усё тое, што народ называе „простым“, па кніжках дайшлі, што мусіць называцца „беларускім“. Беларусь гэта ня тое, што Расея: Расея для нас усіх чужая і нас ня любіць. Беларусь ляжыць паміж суседзямі: з усходу сонца ад нас—ляжыць Расея, з поўдня-Украіна, з заходу—Польшча, а з поўначы—Літва.

Наша айчызна патрэбна для нас, бо пад чужымі панамі лепшай долі не дачэкаем. Гляньце, была Расея у нас: чыноўнікі былі з Маскоўшчыны, памешчыкі з Польшчы,—значыць, найлепшыя кускі зьядалі чужынцы. Наш брат толькі у Амэрыку пёрся з бяды ды гора. А калі і даскрабаўся да чаго лепшага, то зараз у маскоўскую, або у польскую лез скуру і абрастаў чужой шэрсьцяй; устыдаўся роднага народу, а рабіўся панам.

Цяпер іншыя парадкі: паноў няма і ня будзе. У нашай старане усё для нас быць павінна: беларуская зямля—для беларусаў; бо наш Край—Беларусь, а мы тутэйшыя гаспадары і па чужых кутох нам бадзяцца годзе! Але гэта само ня прыдзе, калі толькі будзем сядзець ціха, дыківаць пальцам у боце. Усе народы цяпер шукаюць і дабіваюцца свайго права, а мы яшчэ тупаем і ўстыдаемся у пашпарце пісацца беларусамі. «Пішыце, паночкі, што я польскі», а другі скажаць: «пішыце, што тутэйшы». Годзе вам, Браты Беларусы, за чужым ганяцца! За морам вясельле ды чужое, а ў нас гора ды сваё. Што нам дала Расея? Згубіла нас і атуманіла нам народ, што цяпер ня ведае хто ён такі.

Вось, браточкі, мы ці каталікі, ці праваслаўныя—то ўсё роўна Беларусы. Наша родная Беларусь, старонка харошая і народ наш парадачны: просты, але добры і працавіты. Нашто нам шукаць долі ў чужыне, калі ў сваім родным Краі ляжаць закапаныя скарбы.

Хлопчык з-пад Гродны
(Крыніца).

▪▪▪▪▪▪▪▪

З беларускага вайсковага руху.

Пачатае ў канцы 1918 года, пры нямецкай акупацыі у Вільні, пры супольнай працы з ліцьвінамі, фармаваньне беларускіх часьцей у 1919 годзе, з прыходам бальшавікоў у Вільню, пераняслося у Горадню, дзе і сфармаваліся і існавалі да палякоў—Беларуская Камэндантура, беларускі полк пяхоты і шквадрон кавалерыі.

У Вільні у гэты час савецкі ўрад хаця і цьвёрда праводзіў палітыку аддаленьня ад Масквы, але ня толькі вайсковая, а ўсякія беларускія справы пры ім зусім замёрлі.

12 мая 1919 г. ужо пры паляках у Вільні адбыўся Беларускі зьезд Віленшчыны і Горадзеншчыны, і тады зноў паднялося пытаньне аб войску, а потым паўсталі да жыцьця беларускія вайсковыя арганізацыі у Вільні і Горадні.

У гэтыя арганізацыі, асабліва ў Віленскую, адразу залічылася шмат вайсковых асоб, але у ліку іх было ня мала чужацкага элемэнту, каторы апасьля ці сам адкінуўся ці быў адкінут кваліфікацыйнай падкамісіяй Беларускае Вайсковае Камісіі.

На чале гэтых арганізацыяў стаялі розныя людзі з рознымі паглядамі на арганізацыю войска, а некаторыя з іх мелі навет тэндэнцыю поўнай абасобленасьці арганізацыяў ад установ беларускіх, што стварала душнае паветра інтрыг ў арганізацыях і бязьверыцы да іх Цэнтральнае Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны. Тое нядоўга цягнулася, і ў пачатку верасьня на агульным сходзе сяброў Віленскае Вайсковае Арганізацыі большасьць сяброў адкалолася і яе галасамі была ухвалена пастанова аб існаваньні вайсковых арганізацыяў толькі на грунце незалежнасьці Беларусі і поўнага падпарадкаваньня арганізацыяў Цэнтральнай Радзе Віленшчыны і Горадзеншчыны. Гэта пастанова, з подпісамі ухваліўшых яе, перададзеная Старшыні Ц. Р. В. і Г., стварыла з гэтага часу, патрэбную у вайсковым дзеле цэнтралізацыю ўласьці, дала нормальныя варанкі для супольнае працы і прыдала вайсковым арганізацыям характар існаваньня больш—менш афіцыяльнага.

Тады-ж Горадзенская вайсковая арганізацыя была падпарадкавана Віленскай Арганізацыі, а Віленская—Беларускай Вайсковай Камісіі, вызначанай з Ц. Р. В. Г. Склад Камісіі у далейшым, за адмаўленьнем некаторых, быў перавыбран і дапоўнен яшчэ прадстаўнікамі ад Меншчыны.

Уся праца Віленскае Вайсковае Арганізацыі распадалася ў трох кірунках: 1) Кваліфікацыя жадаючых залічыцца ў арганізацыю (запас афіцэраў іураднікаў), 2) Тлумачэньне статутаў на беларускую мову і 3) арганізацыйная праца.

Усё вялося ў беларускай мове. Усе залічаныя у Віл. Вайск. Арганізацыю праслухалі курсы беларусазнаўства і азнаёміліся добра, як з мовай беларускай, так і з гісторыяй і географіей Беларусі.

Пакуль гэта падгатаваўчая праца рабілася ў вайсковых арганізацыях Цэнтральнай Радай Віл. і Гор. увесь час вяліся перагаворы з польскім Главнакамандаваньнем аб магчымасьці фармаваньня нацыянальнага беларускага войска. І вось 22 кастрычніка у згодзе з дэкляарацыяй Ц. Р. В. і Г. быў выдадзен начальнікам Польскае Дзяржавы дэкрэт аб фармаваньні беларускіх часьцей, існаваўшая да гэтага часу неафіцыяльна Беларуская Вайсковая Камісія гэтым дэкрэтам была зацьверджана з мейсцам пабыту ў Менску, а гэтак-сама быў вызначаны на пасаду камандуючага прапанованы Белар. Вайск. Камсіяй — палк. Канапацкі

У склад зацьверджанай Б. В. К-сіі ўвайшлі: ад Віленшчыны і Горадзеншчыны—п. п. Аляксюк, Мурашка, палк. Канапацкі, палк. Якубоўскі і кап. Кушаль, ад Меншчыны—п. п. Рак-Міхайлоўскі, Аўсянік, Прушынскі і кап. Якубецкі.

І гэтакім чынам з 22 кастрычніка 1919 г. афіцыяльна распачалася праца фармаваньня беларускіх часьцей, незалежна ад польскіх войск, са сваёй нацыянальнай формай і сваёй нацыянальнай мовай.

Палкоўнік К.

Самаапрaвізацыя.

У нас ужо зьявіўся новы для нас і стары для Расеі спосаб апрaвізацыі. Вагоны цягнікоў на Маладэчну, на Сьвянцяны, на Ліду забіты мяшочнікамі, якія што-небудзь вязуць у далекія ад Вільні вёскі і там мяняюць у сялян на прадукты. Тавараабмен, што йдзе праз коопэратывы, псуецца мяшочнікамі, якія зьбіваюць усе нормы і неўспадзеўкі навозяць у хаты сялянам ці таго ці іншага тавару столькі, што ім няма чаго ісьці па тавар ў коопэратыў.

З мяшочнікамі вядуць змаганьне зялезнадарожныя жандары.

Але змагацца з гэтым злом можна толькі скасаваўшы грунтоўныя прычыны, якія прымушаюць мяшочнікаў ехаць за сотню вёрстаў па прадукты. Трэба, каб прадукты былі ў патрэбным ліку ў Вільні і ня толькі, каб іх было даволі, але каб і цэны былі мала даражэй, чымся на вёсках. Другое, што таксама патрэбна зробіць як найскарэй,—гэта палепшыць варункі жыцьця, каб ня трэба было, шукаючы найтанейшых прадуктаў, ехаць кудысь там на вёску, мучыцца начамі ў вагонах, рызакаваць, што адбяруць прадукты. Каб можна было купіць патрэбныя прадукты ў Вільні.

Такім чынам перад апрaвізацыйнымі урадовымі ўстановамі стаіць на чарадзе пільная задача: як-бы задаволіць жыхараў Вільні, каб ім не патрэбна было самім шукаць сабе кожному паасобку танных прадуктаў. Як гэта зробіць, мы ведаем па прыкладу Расеі, гдзе пры Керэнскім і пры бальшавіках прынамся ўсе вялікія гарады карміліся мяшочнікамі. Зьніштожыць мяшочнікаў там удавалася толькі падвозам у гарады прадуктаў, паклікаўшы да шчырай працы ўсе жывыя апрaвізацыйныя сілы краю. Найбольш былі скарыстаны коопэратывы і Саюзы Коопэратываў, як этапы, злучаючыя коопэрырованых жыхараў места з жыхарамі вёсак. Калі ў урадавых установах няма грошы, дык трэба коопэратывам даць ўсе льготы, якія толькі магчыма, і апрaвізацыйную палітыку абаперці на самадзейнасьць саміх спажыўцоў, аб'яднаных у коопэратывы.

Значна можна-б было палепшыць апрaвізацыйныя варункі Вільні, прыяючы дастаўцы прадуктаў фурманкамі ў Вільню на рынкі, дзеля чаго трэба скасаваць рынкавыя падаткі Магістрату пры ўезьдзе ў горад і на рынках.

Пад бокам у Вільні ёсьць жытніца Віленшчыны—гэта Дзісенскі павет, адкуль забаронены вываз прадуктаў у Вільню. Трэба як найскарэй дабіцца зазваленьня на вываз усіх прадуктаў з Дзісеншчыны, Сьвянцяншчыны і Браслаўшчыны.

С. Чыжэўскі.

Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры.

Старая беларуская літэратура—тая літэратура, якая ў пэрыод свайго расьцьвету можа пахваліцца чысьленымі слаўнымі іменамі, як першы друкар беларускі, доктар Францішк Скарына з „слаўнага места Полацка“,—гэта літэратура аджыла свой век—сваю пару нарадзін, расьцьвету і ўвяданьня—і замерла, гаворачы нам аб высокім культурным разьвіцьці нашых дзядоў, але не даючы нам нічога апрача гістарычна памяткі.

Многа было прычын, якія давялі яе да поўнага заняпаду. Былі між імі і соцыяльна-палітычныя, і рэлігійна-нацыянальныя, але перад усім—адна, якая была закладзена ў самой аснове — пры нарадзінах нашае старое літэратурнае мовы.

Пачатак у нас пісьменства ааагух адносіцца да X—XI сталецьця, калі разам з хрысьціянствам дайшлі да нас першыя пісаныя духоўныя кнігі ў такзванай царкоўна-славянскай мове. Трэба думаць, што легенда аб вандроўцы часьці нашых д р ы г в і ч о ў ажно пад Саланікі і аб аселасьці іх тамака пад імем д р у г у в і т а ў мае ў сабе крыху праўды,—або мо' ў тыя часы славянскія пляменьні так-званае заходня-рускае групы так мала розьніліся ад другіх славянаў,—адно толькі ясна, што першыя старабаўгарскія (другувіцкія?) кнігі, копіі гэтых кніг, якія пісалі сьвятыя браты Кірыла і Мяфод, даходзячы да нас, былі для нашага народу зразумелыя. Ведама, язык гэтых кніг ня быў жывым языком нашага народу, на што паказвае хацябы розьніца ў языку старых царкоўных кніг, сьпісываных у нас з старабаўгарскіх, і кніг сьвецкіх, пісаных на месцы, як напр. слаўнае „Слова аб палку Ігаравым“. Але быў ён нам блізкі, быў языком кніжным, быў узорам для нашых кніжнікаў, выкладаўшых думкі свае на паперы, і гэтак лёг у аснову ўсяго нашага пісьменства. У меру разьвіцьця беларускае літэратурнае мовы гэта мова ўсё далей і далей адыходзілася ад царкоўна-славяншчыны,—а ўсё-ж такі традыцый царкоўна-славяншчыны ня кідала. Ня кідала і кірылічнага шрыфту, каторы ў нас значна упрасьціўся, раўнуючы да стара-баўгарскіх кніг (загінулі „юсы“ і т. п.), але, трымаючыся старое традыцыі, іншых гукаў нашае жывое мовы зусім ня выражаў, ня маючы адпаведных знакаў, або выражаў іх умоўна. Так, ня бачым у ім характэрнага для нас „аканьня“ і „дзеканьня“, а замест таксама характэрнага для беларусаў „цеканьня“ („ц“ замест мяккога „т“) сустракаем усьцяж ужывапае „т“. Ня бачым, хаця, як паказаў адкрыты с. п. Іванам Луцкевічам беларускі рукапіс „Ал-Кітаб“, пісаны больш багатай у знакі арабістыкай, ужо на мяжы XVI і XVII ст. сказаныя асобенасьці нашае мовы ярка выяўляліся і ў запісях арабскімі літарамі акуратна адзначаны.

Як „кірыліца“ адбівалася на правільнасьці выражэньня знакамі гукаў беларускае мовы, так царкоўна-славянскія граматычныя правілы сковывалі разьвіцьцё самае гэтае мовы, праводзячы рэзкую розьніцу паміж жывой і пісанай, кніжнай мовай. Праўда, ў меру разьвіцьця нашага пісьменства, мова наша значна вызваляецца ад царкоўна-славянізмаў, але зусім вызваліцца ад царкоўна-славянскай спадчыны ей не ўдалося.

І ў гэтым-то і крыецца прычына ўпадку беларускага пісьменства ў XVIII ст.—мо' не адзіная, але адна з галоўных. Маючы ў аснове царкоўна-славяншчыну і толькі ўвабраўшы ў царкоўна-славянскія рамкі элемэнты народнае мовы, наша старая кніжная мова мала-па-малу п а д у х у с в а й м у станавілася ч у ж о й н а р о д н ы м м а с а м, асабліва тады, як пасьля зблізкэньня з Польшчай у яе папала многа лацінізмаў і полонізмаў. Яна сталася мовай інтэлігенцыі. Жывая народная думка не магла карыстацца ей дзеля свайго выяўленьня: яна шукала іншых форм,

больш блізкіх, родных. І яна, разарваўшы ўсе старыя традыцыі, знайшла гэтыя формы: знайшла ў жывой беларускай гутарцы.

Ня дзіва, што беларускае нацыянальнае адраджэньне пачынаецца з адраджэньня мовы,—справядлівей: з разьвіцьця народнае гутаркі ў мову літэратурную. Для новых думак патрэбны новыя формы, а адраджэньне народу, падняцьце шырокіх народных мас на вышэйшую ступеню культурнага і грамадзкага жыцьця—гэта і былі тыя новыя думкі, якія прышлі да нас, як адгалоскі Вялікае Францускае Рэвалюцыі.

Першыя спробы жывой народнай мовы прабіцца наверх, першы чынны пратэст проці задушанай царкоўна-славяншчынай, лацінізмамі і полонізмамі кніжнай мовы мы бачым яшчэ ў XVIII сталецьці ў постаці так-званых „інтэрмэдый“, або „інтэрлюдый“, каторыя ўвялі на сцэну народнага тэатру „людзей посполітых“ з іх „простай“ гутаркай. А сьледам за гэтым ад самага пачатку XIX ст. гэтая-ж „простая“ гутарка становіцца ўлюбленым способам выяўленьня думкі ў пісаным слове як для нашых рамантычных пісьменьнікаў, так і для тых, хто, захоплены вялікімі ідэямі Волі, Роўнасьці і Брацтва, йшоў да народу, каб будзіць яго ад сну дзеля вялікае справы. І нашы рамантыкі, і дэмакраты, якія паводле сваей ідэолёгіі становяць два розныя кірункі, ў адносінах да мовы беларускай заслужыліся роўна: і адны, і другія творчай працай сваей з народнай гутаркі твораць новую беларускую літэратурную мову, вольную ад перажыткаў старасьвеччыны, ад панаваньня замершае старое кніжнае мовы. Тут мэты іх—адны, тут яны йдуць аднэй дарогай.

Гаворачы аб гэтым тэорэтычна, ня кожнаму ясна тая розьніца, якая істнуе паміж нашей старой і новай літэратурнай мовай. Яна стала яснай тады, калі мы адну з апошніх друкаваных кніжак канца XVIII ст. прыраўнуем да мовы першых вершаў Баршчэўскага (1809 г.), або да мовы беларускай „Энэіды“, напісанай зараз пасьля напалеонаўскага паходу ў Расею, а мо' і яшчэ раней. *) Наскольні вершы Баршчэўскага блізкі да народнай паэзіі, паказвае факт, што сучасны яму А. Рыпінскі, папаўшы, як эміграит, у 30-тых гадах у Парыж, у сваіх лекцыях аб Беларусі дае з памяці прыклады народных песень і, паміж імі, выдае за народны твор „Рабункі мужыкоў“ Баршчэўскага.

Як ужо сказана, і першыя прадстаўнікі нашага шляхоцкага рамантызму, і першыя нашыя дэмакраты зышліся на адным: на тварэньні беларускай літэратурнай мовы з народнае гутаркі. Паміж іншым, Дунін-Марцінкевіч вельмі ярка давёў гэтага сваім перакладам на беларускую мову „Пана Тадэуша“ Міцкевіча (за яго прыкладам, тую-ж працу зробіў і Александар Ельскі). Але ў тыя творы, якія пакінулі нам у спадчыну прадстаўнікі абодвух кірункаў, яны ўкладалі зусім розныя ідэі, зусім розны ідэолёгічны зьмест. Болей таго: яны зусім рознымі вачыма ўглядаюцца на наш народ і так розна прамаўляюць да яго!

Ант. Навіна

(Працяг будзе).

*) Некаторыя гісторыкі нашай літэратуры пры азначаньні часу напісаньня „Энэіды“ пазываюцца на ужытыя у ей словы „як ад Кутуза Бонапарт“. Другія думаюць, што гэтыя словы маглі быць пазьнейшай устаўкай, а сама „Энэіда“ быццам сягае конца XVIII ст.

ХВАРОБА І ЛЯКАРСТВА АД ЯЕ.

I.

Што католік—то і поляк!
Ай, калі-б, калі маскалі прыйшлі...
Сфальшаваныя «прыказкі».

Беларускі народ, дзіўным выпадкам гістарычных здарэньняў запомнены ўсім сьветам. Добра помняць аб ім толькі самыя блізкія яго суседзі-палякі і маскоўцы, каторыя адзін перад адным стараюцца зрабіцца яго няпрошанымі апякунамі.

Забітае экономічна, цёмнае і неасьвечанае беларускае селянства залежна ад сваей веры старалася малпаваць тых, альба другіх, што і патрэбна было палякам і маскоўцам.

Такім парадкам на Беларусі стварылася тое, што можна было бачыць да астатняга часу: беларускія сяляне забылася аб тым, хто яны. Хоць гаварылі ўсягды як дома, так і за домам пабеларуску аднак, калі хто пытаўся, якой яны веры, адказывалі „польскай“, калі былі каталікі, і „рускай“, калі былі праваслаўныя. Далей іх паняцьце не сягала нагул. Пазбаўлены школы народ аставаўся ў цемнаце і з паняцьцем рэлігіі і яе назвай вязаў праве ўсягды і паняцьце аб нацыянальнасьці. У паняцьці простага нашага селяніна вайна магла быць толькі паміж народамі рознай веры. Шчырыя і справядлівыя ад прыроды, яны, а таксама і бяднейшая шляхта, з вялікай пашанай аднасіліся да чужых і ўсяго чужога. Нігдзе ня была, здаецца, так моцная гасьцінасьць, як на Беларусі. Кожнага падарожнага кожны лічыў за абавязак накарміць і прытуліць на начлег. Адказаць у гэтым падарожнаму лічылася за грэх. Усе былі пэўны, што гэтак ёсьць і на ўсім сьвеце. Ці гэта так, ці не—праканацца не маглі, бо нікуды праве ня езьдзілі.

II.

Чужое усягды смачней.
Прыказка.

Ішоў год за годам. Людзі радзіліся, жылі і ўміралі. Шляхцюкі ў будні дзень гаварылі „папросту“, насілі лапці і елі поснае. Прыхадзіла сьвята і ўсё пераменялася: хаваліся пад палок лапці, а адкульсьць зьяўляліся намазаныя дзёгцем боты; у поснай праз увесь час капусьце раптам зьяўлялася скварка затаўкі. Не дарма кажуць людзі, што як добра хто пад'есьць, то і гумару набярэцца. Так было і тут. Пад'еўшы тлустой капусты, людзі чуліся неяк лепі і зачыналі думаць аб тым, што і ўсягды-б так жыць было-б ня блага. Бо ёсьць-жа людзі, што ўсягды так жывуць, „вось хоць-бы наш пан“. — „Але-ж пан гаворыць папольску“...—„А ці-ж мы, даўнейшая шляхта—патомкі быўшых дружыньнікаў, ня можам гаварыць папольску?“ Ну і гаварылі „папольску“ хоць у сьвята.

Адчасу-дачасу камусь з іх ухмылялася шчасьце, там ці іншым способам нажыць-такі больші кусок зямлі. О, цяпер іншая справа. Цяпер ня толькі ў сьвята, але і тады, калі ў хаце ёсьць госьці, ня толькі можна, але і патрэбна гаварыць папольску. Бо чым я горшы за гэнага вун пана, у каторага з усяго яго маёнтку асталося ня болі зямлі, як у мяне.—Але што там пан. Панскі агаіном, што прыехау з Варшавы, ані пядзі ня мае сваей зямлі, а гаворыць папольску, а я чым горшы за яго?“

Час бег у перад, а з ім і ўсё жыцьцё. Як ня было трудна, але той-гэты паслаў дзіця ў школу, дзе яно навучылася чытаць і пісаць парасейску. Узрадавалася, гледзячы на гэта, бацькоўскае сэрца, і задумаўся бацька з маткай. Ня сьпіцца ім у ночы, ня есцца у дзень. Забраўшыся на палаці, ўсю ноч аб чымсьці шапталіся, а назаўтрае ўсталі абое раней, чым усягды, і жвава ўзяліся за штодзенную працу: бацька даглядаць жывёлу, маці тапіць у печы. Не пасьпела маці зачыніць засланкай печ, як у хаце зьявіўся ўжо бацька і спытаўся, ці гатоу абед?

— Гатоў,—адказала маці.

— Ну, дык дай мне вады і абедаць, а сама нарыхтуй там што-небудзь на гасьцінец пісарысе.

Праз два дні хлопец ужо скрыпіць пяром у воласьці, і пісар кажа, што мае вялікія здольнасьці.

Так пачалася яго кар'ера. Праз год ён ужо пісаў павесткі ў земскага начальніка і, прыехаўшы у родную вёску, гаварыў „парасейску“, бо так прыказала начальства. Гледзячы на яго, і другія, а асабліва дзяўчаты, каторыя хацелі яму падабацца, пачыналі гаварыць парасейску, „каб ня быць горшымі“.

Тут ужо расейская мова сталася сьвяточнай. Ужываўшыя яе людзі, заўсёды, праве, былі праваслаўныя.

Здавалася, што неякая ліпучая хвароба чужаманства ахапіла Беларусь і што няма ад яе ўжо ніякага ратунку. А нашы апякуны, не баючыся пошасьці, пазіралі на гэта і пацiралі ад радасьці рукі.

III.

На усе тое золата, што блішчыць.
Расейская прыказка.

Але вось адкуль ні вазьміся ўсясьветная вайна. Як дзень, так ноч цягнік за цягнікам пацягнулі праз Беларусь на граніцу салдат. Паслушныя царскаму слову, ехалі тыя у незнаёмы ім край, ехалі, каб запляваць яго сланечнікавай шалухой і засланць сваймі касьцьмі. Тут першы раз нашы сяляне убачылі праўдзівую Расею і зьдзівіліся яе „пекнасьці“.

Пакуль расейская армія йшла наперад, было яшчэ сяк-так. Сяляне бачылі яе, але бліжэйшай стычнасьці ня мелі. Праўда і з гэтага „бачаньня“ сяляне многа чаго даведаліся. Але вось немцы, сабраўшы сілы, стукнулі ей разоў некалькі па галаве, і яна, як гліняная, пачала рассыпацца ў кускі і валіць назад, кідаючы немцам ня толькі Польшчу і Літву, але і заходнюю часьць Беларусі. Цяпер нашы сяляне ня толькі бачылі маскалёў, але і мусілі з імі жыць, а многа хто, кінуўшы хату і родную ніву, паехаў у Маскоўшчыну, на Волгу, у Сыбір і т. д., думаючы, што там яго адзенуць і накормяць, не гаворачы ўжо аб тым, што дадуць пад страхой прытулак ад непагоды і холаду. Здавалася іначай і не магло быць, бо яны цярпелі за агульнарасейскую справу і яшчэ не абы-як: далі у першую чаргу і на першы агонь лепшых сваіх сыноў — салдат, таксама, як і іншыя, складалі грошы на гэтыя страшныя гарматы, кулямёты, аэропляны, тэлефоны, тэлеграфы, аўтамабілі і г. д. і г. д. Удабавак да усяго, спалены іх будынкі, парэзана скаціна, скапана ровамі ніва, а за што? За агульна-расейскую справу. Дык няужо-ж іх, якія гэтай справе афяравалі найболі, не зразумеюць усе і не памогуць ім? Але гдзе там...

IV.

Пану верна ня служы,
Жонцы праўды не кажы,
А чужога ня мей за свайго.
Прыказка.

Праўду кажуць старыя людзі, што бліжэй кашуля, чым кабат. Так было і тут. Што было расейцам да нас, калі у самых скура ўжо трашчэла. Якога ліха будзеш тут думаць аб кімсь, калі вун сына завуць на прызыў, дровы даражэюць, хлеб і карасіна таксама. Але ня думаць няма як, бо вун хтосьці стукае ў дзьверы. Праз хвілю на парозе зьяўляецца ня брыдка прыбраная кабета. Гаспадар ласкава просіць садзіцца. З першых слоў госьці гаспадар ужо пакручывае галавою і закурывае папіросу.— „Так, панічка, так, кватэра ёсьць і не благая, але вам, выбачце, не аддам“.

А. КАНЧАР.

Клясавае, нацыянальнае і рэлігійнае змаганьне на Беларусі.*)

Тэрыторыя.—Насяленьне.—Клясавы склад.

III.

Клясавы склад насяленьня.

Усё насяленьне Беларусі можна разьдзяліць на гэткія клясы: а) вытворчыя (праізвадзіцельныя): 1) сяляне, 2) работнікі і рамесьнікі, 3) працоўная інтэлігенцыя; б) нявытворчыя: 1) паны (шляхта), 2) гандлёвая буржуазія. Усяго 5 клясаў. У гэтым парадку мы разгледзім кожды кляс паасобку.

А. Вытворчыя (праізвадзіцельныя) клясы.

1. *Кляс сялянства.*

У пэрыод X—XIII вякоў па Р. Х. беларускае грамадзянства складалася з гэткіх клясаў.

На чале грамадзянства стаяла князеўская дружына. Яна распадалася на дзьве часткі — вышэйшую, баярскую, і ніжэйшую, служылую. Першую частку складалі блізкія да князя — разумныя і паважаныя людзі, дарадчыкі і купцы і прышэльцы з суседніх і заморскіх земляў, а другую — салдаты і слугі.

Дружына разам са сваім князем выдзелілася з усяго складу насяленьня, утвараючага вайскова—гаспадарчы саюз.

Другім больш чысьленым клясам зьяўляліся земляробы, скатаводы, стральцы і рыбаловы. Гэта—тая маса, якую мы будзем называць працоўным народам.

Упасьледку гэты кляс прыняў назоў сялянскага кляса. Ен і перш і цяпер займаў на Беларусі, як і у другіх гаспадарствах, першае месца. У цяперашні час на Беларусі ён займаець каля 56% усяго насяленьня.

У IX—XI вв. Беларусь ня ведае прыватнай уласнасьці і валаданьня рабамі. У сваім грамадзянскім жыцьці народ быў вольны і таксама вольна карыстаўся з дароў прыроды. Падуладнасьць яго к князю гранічылася ўплатай падаткаў і выпаўненьнем натуральных павіннасьцей. Такое грамадзкае будаўніцтва Беларусі прыдавала народу вялікі дэмакратычны колер і азначала яго самастойнасьць у нацыянальных і рэлігійна-рэфармацкіх адносінах.

З працягам часу права карыстаньня зямлёю пераходзіць у права ўласнасьці, гэтае права асьвячаецца звычаем і князеўскаю ўладаю.

Выпрацовываецца права на ўладаньне працоўнай сілай селяніна, а затым на ўладаньне самім селянінам, як працуючай скацінай. Ужо ў XV веку, г. ё. спачатку Польска-Літоўска-Беларускай уніі, паншчына на Беларусі набіраець моцы і значаньня. У той час налічаліся дзьве групы „людзей“, з аднаго боку „пахожыя“, „вольныя“, а з другога—„непахожыя“, „цяглыя“. Першая група працоўнага люду была незалежнай, магла перяжджаць з месца на месца і выбіраць сабе занятак. Пахаджэньне яе самае аддалёнае: яна зьяўляецца насьледзьдзем качавога рыбалоўства, скатаводства і земляробства. Другая група, наадварот, не магла перахадзіць з месца на месца і выбіраць сабе занятак і аставалась прымацаванай да гаспадаркі свайго пана. Гэтая катэгорыя „людзей“ зьявілася пазьней, у часе паміжасобных войнаў удзельных князей і асабліва спачатку гаспадараваньня на Беларусі палякоў, калі князі і магнаты сталі шчодра дарыць зямлю, разам з сялянскім працоўным насяленьнем, сваім улюбенцам і бліжэйшым сартнікам. Паступова лічба „цяглых“ павялічвалася, а лічба „вольных“ зьмяншалася, чаму дапамагала выпрацаванае звычайнае права і законы вялікіх беларуска-літоўскіх князёў і польскіх каралёў.

Паншчына давалася ў знакі ўжо пры Ягайле (1386—1392). У рэзультаце, Вітаўт падняў сялянскае паўстаньне і прымусіў Ягайлу ўступіць яму, Вітаўту, Беларуска-Літоўскі вялікакнязеўскі прастол. Вітаўт мала зрабіў, каб палягчыць жыцьцё сялян пад паншчынай.

Вялікі князь Казімір, законадаўца, падараваў сялянству грамату (1457), па якой шляхце давалася права ўдзержываць на сваіх землях сялян і ня прыймаць сялян беглых і расьсяляючыхся. Жыгімонт I (1506—1548) выдаў ацэначныя правілы даходаў зямлі, правілы аб інстытуце даглядчыкаў за гаспадарчай дзеяльнасьцю паноў, правільней, за іх заступнікамі, і правёў цераз сойм (1520—1521) закон, на моцы якога сяляне павінны былі аставацца на панскай зямлі і, незалежна ад раней выдадзеных сялянам прывілеяў (прававых грамат), адзін раз у тыдзень працаваць на пана. Жыгімонт II Аўгуст (1548—1572) быў увесь пад уплывам шляхты і значную частку каронных двароў разам з сялянамі аддаў ува ўладаньне шляхты (праведзена на соймах варшаўскім 1564 і петракоўскім

*) Гл. № 3 „Н. Д.“

— Чаму?

— Бо вы, панічка, як я бачу з вашай вымовы, бежанка, а бежанцэм я не аддам, бо ў іх мэблі няма, адзежы таксама, а дзяцей пэўна многа, дык не аддам, — і гаспадар устае. Жадная просьба не памагае і кабета, зальваючыся сьлязьмі, выходзе на вуліцу, каб ад хаты да хаты, ці хто бедны ці багаты, хадзіць аж да вечара і шукаць кватэры. А ў гэтым часе дзэці сідзяць гдзесьці там у садзе, прыкрытыя небам, бо гэткую кватэру адвёў ім урадовы камітэт помачы уцекачом.

V.

Сваю віну на другога зьвярну.
Прыказка.

Але вось кватэра знайдзена, і здавалася-б, гора скончана. Гдзе там, калі людзі глядзяць на цябе, як на ваўка. Для іх ты не патрапіш ані стаць, ані сесьці, бо у іх гэта робіцца ўсё іначай: іначай пячэцца хлеб, іначай варыцца абед, іначай гавораць, іначай адзяюцца, і ў іх гэта ўсё робіцца лепі, чым у „гэтых чортавых бежанцаў".

Толькі і на тым бяда ня скончылася. Бежанцы, як выявілася наастатку, прычына ўсяго благога, голаду, холаду, безрабоцьця, ба! навет вайны, бо за што-ж ваююць, калі не за іх і іх праклятую зямлю. І бежанцам адкрыта пачалі гаварыць аб гэтым, а часам і пагражаць, што іх трэба выразаць, бо толькі тады усе падзешавеець і настанець „рай".

Як сьцюдзёнай вадой абдало ўсіх нашых цікунцоў. Зразумелі адразу, што яны, хоць і славяны, але зусім іншы народ, чым маскоўцы, і пачалі гарнуцца ў кучу з клічам: „Хай жыве вольная Беларусь".

VI.

Найні веры вачом—рукамі намчупай.
Прыказка.

Ня горшага лекарства ад расейскага дуру дасталі і тыя, што засталіся удаму, як маскоўскія салдаты пачалі іх высьмейваць і заплёвываць шалухой ад сланечніку, пераплятаючы ўсё гэта з самымі благімі словамі. А тымчасам усе нашы сяляне бачылі, што апрача лаянкі і п'янства, трудна ад іх чаго добрага навучыцца, а скарэй за ўсё можна многа чаго добрага забыцца. Хлеб на крошкі мяняць ня варта. І ўспомнілі тут сяляне пра тое, што яны беларусы, ўспомнілі пра тое, што яны—народ і ня горшы ад другіх народаў, ўспомнілі пра тыя песьні, якія пялі іх бацькі і прадзеды, і з радасьцю ў вачох сталі пазіраць у той бок, гдзе раздаўся топат старадаўнай Пагоні.

В. Грыневіч.

(Працяг будзе).

* * *

Лятуць, лятуць гусі
У далёкі вырай:
Усё хавацца мусі
Ад нядолі шчырай.

Гусанькі, вы, гусі,
Крыльле мне спусьцеце,
Можа, падымуся
З вамі й я ляцеці.

Бо ўжо месяц цэлы
Воддаль родных гукаў
Тут з душой збалелай
Гіну я між мукаў,

Між галодных людзяў,
Між хваробы, сьмерці,
З тасканатой у грудзях,
З каменем на сэрцы.

Лятуць, лятуць гусі
У даль за сіне мора —
Не зважаюць, мусі,
Ні на жаль, ні гора.

Аж, чакайце, гусі,
Я вас запытаю,
Можа, ля мамусі
Праляціце краю.

Там ля роднай вёскі,
Ведаю я, знаю,
Выйдзе на палоскі
У бок шумнога гаю.

Гдзесь на захад сонца
Сын яе забраны...
Мучаць мо' бяз конца...
За што? незгадана...

Што любіў краіну
Ен усей душою,
Што яе ня кінуў
Грознаю парою.

Нікаму-ж у жыцьці
Не зрабіў благога...
Нікаму ня жычыў
Кепскага нічога.

Ах, скажыце гусі,
Што я жыў, здаровы,
Зараз павярнуся,
Вольны, без аковаў.

Лятуць далей гусі
У свой у даль далёкі,
Нашай Беларусі
Толькі краем-бокам.

Гусі, пачакайце
На адну хвіліну...
Момант... прывітайце
Родную краіну...

Паляцелі гусі...
Ужо на краю неба...
Ім ні Беларусі
Ні мяне ня трэба...

Ігнат Дварчанін.

* * *

Я люблю песьні ветра у полі
І вясёлых сьняжынак гульню,
Калі ў хаце ня хочацца болі
Мучыць думкамі душу сваю.
Я люблю выйсьці ў час, калі хмары
Дагараць, калі захад загас,
Калі цені агорнуць абшары, —
У зьмярканьня зімовага час.
У вёсцы ціха... ўсё сьнегам адзета,
У белай рызе рабіны стаяць,
У вокнах зоркі чырвоныя сьветла
Там і тут, загарэўшысь, дрыжаць.
Засыпаючы сад каля школкі,
То барджэй, то—паціху ізноў
Пылам сыплюцца лёгкім іголкі
З беласьнежных нябесных палёў.
Густа, густа лятуць яны, ірвуцца,
Мчацца з ветрам у белы прастор,
То,—рассыпаўшысь, ў вольхах саб'юцца
То—хаваюць агоньчыкі зор.
Усё у полі зьмяшалась, здаецца,
Віхор круціцца, б'ецца, пяе.
Мо' змагаецца з кім, мо' сьмяецца,
Мо' хавае надзеі свае?
Лес гдзе хвойкі, сасонка ў сасонку
У ясны дзень зрасталі сьцяной, —
Мглы агорнуты белай пялёнкай,
Мглы, што неба зьмяшала з зямлёй.
І ўсю ноч у бялеючым полі
Карагоды сьняжынкі вядуць.
То — баюкаюць песьняй аб долі,
То — хаўтурныя гымны пяюць.
А нам, дык чаго нам жадаць?
Для нас ўся зямля з яе крыўдай
І сумныя далі палёў,
І песьні жальбы і пакуты,
І жыцьця туга і атрута,
І шчасьце нядоўгае сноў.

Натальля Арсеньнева.

* * *

Завець мяне сіняе неба,
Завець мяне вольны прастор,
Дзе месяц між хмарак гуляець,
Дзе вочкі празрыстыя зьзяюць
Нясьмелых сярэбраных зор...
Завець мяне сьветлае сонца,
Я ласкам яго аддаюсь.
Хацела-б на сонца глядзець я
Часы, і гады, і сталецьці...
Хачу, ды асьлепнуць баюсь.
Ня нам яго, яснае, бачыць,
Ёя нам яго ласкі пазнаць:
Магутным арлам яно сьвеціць.
І іх толькі ў небе прымеціць

Шмат старонак...

Шмат старонак ёсьць на сьвеце,
Сонца сьвеціць дзе сьвятлей,
Ды з усіх старонак гэтых
Мне радзімая мілей.

А чаму? Я сам ня знаю.
Цягне ўсё мяне туды,
Бо там доля векавая
Поўна гора і нуды.

Сяргей Чараўнік.

Аб тым, як ксяндзы вылячыліся*).

Тры гладкія, атылыя ксяндзы сабраліся ехаць на воды лячыцца. Яны растаўсьцелі, як адкормленыя вапрукі. Чаго яны не рабілі, якіх зельляў ня прыймалі, нічога не памагае. Дактары кажуць, што ім трэба ехаць на воды, дык там лою збудзе. Паехалі ксяндзы па панох зьбіраць грошы на дарогу. От прыяжджаюць яны к аднаму пану і жаляцца яму на сваю бяду. Просіць пан ксяндзоў пасілкавацца ды пераначаваць. Заначавалі ксяндзы. Пасадзіў іх пан вячэраць ды так участаваў, што ксяндзы і заснулі пры стале. Храпуць ксяндзы на ўсе застаўкі, сьпяць так моцна, што хоць з гармат страляй—не пачуюць. От загадаў іх пан разьдзець, перанясьці ў бровар дый палажыць там разам з браварскімі работнікамі. Прачухаліся назаўтра троху ксяндзы, але ня ведаюць дзе яны. Але ось і будзяць дзяцюкоў набіваць картаплянік. Падняліся ксяндзы і не хацелі ісьці на работу, але як перацёг іх намесьнік бізуном, нябось, пашлі. Робяць ксяндзы разам з другімі ўсё, што трэба ў бровары, разам ядуць, разам сьпяць і ніяк ня могуць з бровара вырвацца. От праходзіць тыдзень — другі, і пачало з ксяндзоў спадаць сала, а пераз тыдняў пяць яны падгіндзіліся, як харты. Паглядзяць яны адзін на аднаго і пазнаць ня могуць, так выпятралі за гэтыя пяць тыдняў. Думалі ўжо ксяндзы,

*) Са зборніка Сержпутоўскага: «Казкі і расказы беларусаў-палiшукоў».

1567). Некаторую частку сялянства ён надзяліў валокамі (надзеламі) зямлі, па 19½ дзес. валока, і абавязаў сялян не сходзіць з гэтай зямлі інакш, як з заменай сябе той самай вартасьці работнікам і працаваць, разам з тым, на пана.

Наагул пры астатніх Ягелонах (насьледнікі Ягайлы) Жыгімонце І і Жыгімонце ІІ шляхта найбольш пачала разьвівацца і рэзка паказала свой нахіл да прыгону.

Далейшая гісторыя Польшчы і Беларусі складалася не на карысьць унутранага міру і культурнага будаўніцтва. Польскія каралі і польскія паны былі заняты палітыкай звонку, а ваявалі бесьперастанку з Маскоўшчынай, Турцыяй, Аўстрыяй, Швэцыяй і г. д. і наагул займаліся ваяўнічай імпэрыялістычнай практыкай. Дробная і сярэдняя шляхта, карыстаючыся з гэтага і будучы прымушана нясьці вялікія падаткі і службовы цяжар, якія выклікала вайна, павялічвала сваю ўладу над сялянамі, прымацовывала іх да сваіх маёнткаў і крысталізавала асобны кляс прыгоннага сялянства.

У канцы XVII в. ўжо было апрацована і ўведзена ў практыку права пана ня толькі прадаваць, але рашаць жыцьцё і сьмерць свайго „хлопа". Праўда, гэтае права (жыцьця і сьмерці), пад націскам рускай партыі і маскоўскіх цароў, было адменена соймам 1768 г., але на практыцы яно было.

Жыцьцё для працоўнага народу рабілася цяжкім, нязносным, народ прабаваў уцякаць у лясы і балоты, на паўдзён к вольным казакам.

Кляс працоўных і вольных казакоў фармаваўся на паўдні з зьбеглых сялян. Сюды ўцякала шмат панскіх падданых з Маскоўскага гаспадарства і яшчэ балей з Беларуска-літоўскага гаспадарства. Казакі абраблялі зямлю на вольных началах, зямля зьяўлялася агульна-казацкім дабром. Польская шляхта цераз сойм і караля старалася спыніць бегства шляхам заваяваньня казацкіх абласьцей. Шляхта мела яшчэ і другую мэту: закрапленьне за сабой казакоў, як сваіх падданых. Першую гэткую спробу зрабіў кароль Стэфан Баторы (1572—1586). Сойм 1590 г. аддаў казако пад уладу кароннага ці-то урадавага гетмана. Сойм 1638 г. пры Уладыславе IV (1632—1648 г.) выдаў закон аб перавароце вольных казакоў у „хлопаў", аб зьніштажэньні самастойнай арганізацыі „рэестравых" і аб перадачы ўпраўленьня імі ў рукі польскага камісара.

К часу разьдзелаў Польшчы (1793 г.) сялянскі кляс на Беларусі складаў паважную армію.

У часе І-га разьдзелу ў Усходняй Беларусі налічалася каля 199 тыс. гаспадарсьцьвеных сялян ці 38 працэнтаў усіх сялян і панскіх падданых 316 тыс. ці 62 проц. Па ІІ-му разьдзелу Польшчы да Расеі адыйшло сялян з аднэй толькі Менскай губэрні каля 3 міліёнаў чалавек:

У старастаўскіх дв. . . .	да	82	тыс. чал.
„ панскіх дв.	„	2709	„ „
„ двар. царкоўн. інш. рэлігій	„	63	„ „

Кацярына не палепшыла палажэньня сялянства, наадварот узмоцніла ў Беларусі панскае земляўладаньне і пашырыла кляс сялян пад прыгонам. Так, напрыклад, к канцу яе царстваваньня гаспадарсьцьвеныя сяляне ўжо складалі толькі 11 проц., а панскія 89 проц.

У 1862 г. сяляне былі звольнены ад паншчыны, але ня звольнены ад панскай кабалы. Сялянскае малазямельле, з аднаго боку, і надзвычайна вялікія абшары зямлі ў паноў—з другога, заўсёды рабілі войстрымі адносіны паміж двух няроўных клясаў. Беларускае сялянства ў вызваленчым руху аказалася жывучым і рэвалюцыйным і шмат пасабляла дыферанцыяцыі (падзелу) шляхты. У пэрыод 1905—1906 г.г. беларускае сялянства бунтавалася з-за зямлі. Напрыклад, блізка што ў кождым павеце краю сяляне секлі панскі лес, травілі сенажаці, баставалі па дварох (асабліва у губэрнях Горадзенскай і Віленскай) і г. д. Але калі мы параўнуем зямельныя бунты на Беларусі з такім самым рухам у Расеі, дык заўважым, што беларускія сяляне вельмі рэдка падпалівалі і грамілі двары і да т. п. Такая ўжо асобная прырода беларускага сялянства: ён надта паважаець чужую працу і ўласнасьць і шануець навет свайго клясавага супраціўніка.

К упраўленьню краем сяляне не дапушчаліся ні ў Беларуска-літоўскім, ні ў Польска-літоўскім, ні ў Расейскім гаспадарсьцьве. Але да Беларуска-літоўскай уніі, г. ё. да палавіны XIII века па Р. Х., да абразаваньня Беларуска-літоўскага гаспадарства яны ўваходзілі ў упраўленьне краем цераз сваіх найбольш паважаных выбарных. Астатнія складалі Народную Раду пры вялікім князю. У пэрыод 1180 — 1190 г.г. Полацкае княжства, якое займала блізка што ўсю тэрыторыю цяперашняй этнаграфічнай Беларусі, зусім адраклося ад князя і перайшло да рэспубліканскага парадку.

2 Кляс работнікаў, рамесьнікаў і рукадзельнікаў (кустароў).

Да гэтага кляса можна аднесьці дробных рамесьнікаў, самадзельшчыкаў, работнікаў у сельскай і лясной гаспадарцы, на фабрыках і заводах, а таксама безьзямельнае сялянства.

У сярэднія вякі у мамэнт найбольшага разьвіцьця вырабу, на Беларусі быў значна абшырны кляс рамесьнікаў. Пападаліся цэлыя сёлы і мястэчкі, ў якіх жылі выключна рамесьнікі—гарбары, шаўцы, краўцы, кавалі, такары, цесьлі, сталяры, лапатнікі, бёрдзікі, рашотнікі і г. п. Сярод клясу рамесьнікаў было шмат жыдоў. Да далучэньня Беларусі да Расеі ў гарадох панавала магдэбурскае права. Яно дазваляла рамесьнікам мець свае цэхі—работніцкія арганізацыі для абароны сваіх прафэ-

што гэта іх чэрці ўхапілі і засадзілі ў бровар на пакуту; думалі, што ўжо ім ніколі адтуль ня выбавіцца. Раз загадаў пан даць браварскім работнікам вядро гарэлкі, а ксяндзом—лепшае гарэлкі, самае моцнае. Напіліся яны і бяз памяці пассоваліся ў бровары каля катла. Як ксяндзы моцна заснулі, пан загадаў перанясьці іх у ахвіціну і палажыць там, дзе яны ляжалі першую ноч. Прахапіліся назаўтра ксяндзы і трасуцца, спалохаліся, што позна спалі; баяцца, каб намесьнік не лупцаваў іх бізуном; сталі скарэй апранацца, але бачаць, аж каля іх ляжыць ксяндзоўская адзежа. Дзівяцца ксяндзы і вачом ня вераць. Адзеліся яны, але ось прыходзіць пан, заве гарбату піць. Стаў гэта пана частаваць ксяндзоў дый пытаецьь, куды яны думаюць ехаць на воды.—Не—кажуць ксяндзы ў вадзін голас—цяпер ня трэба на воды, бо мы ўжо вылячыліся.

І. Аземша

Кажан.

У вялікім пакоі было сумна і няпрыветна. Сьвечка, што стаяла на століку, кідала навокал яго крыху сьвету,—далей ўсё нікла ў цьме. На канапцы сядзела паня Караліна і з трывогай прыслухівалася да хрыпу і сьвісту ў другім пакоі. Гэта яе маці першы раз у жыцьці захварэла і ляжыць ужо з тыдзень. Цяжка адной пры хворай, цяжка глядзець, як адзіная дарагая істота на сьвеце, мучыцца і б'ецца у гарачцы. Але нічога, арганізм у хворай моцны, і яму нічога не пагражае... Гэтая трывога, што йдзець з глыбіні душы,—проста ад бяссонных ночаў. Трэба узяць сябе у рукі і пастарацца заснуць. І паня Караліна загасіла сьвечку, папраўіла падушку, заплюшчыла вочы і старалася заснуць. Але сон ня йшоў. Яна пачала ўспамінаць сваё дзяцінства і дзявоцкія гады і матчыны адносіны да яе змалку. Яна была дзяўчынкай з гарачай фантазіяй і заўсёды лятуцела аб нейкіх фантастычных краёх, аб нейкім іншым, нятутэйшым жыцьці, а падросшы і аб рыцарах і чароўных прынцах. І маці свайй простай, але чулай душой не адрывала сваю дачушку ад гэтага фантастычнага існаваньня, не старалася зьвярнуць яе увагу на практычнае жыцьцё, ня змушала рабіць хатняе працы, але старалася каб зрабіць ёй як маga прыямнейшае і лягчэйшае жыцьцё. Можа быць, у глыбіні душы яна і верыла, што яе стройная, як ясакар дачушка, з вялікімі шэрымі вачыма і сустрэне прынца і ўсё жыцьцё будзе хадзіць па красках... Што-ж, жыцьцё, як заўсёды, ашукала і яе, і пані Караліне прыйшлося жыць так, як усім, забыцца аб чароўных снох і пастарацца, каб староньнія людзі ня бачылі і ня дагадываліся аб гаручых сьлёзах, аб цяжкіх думах. Матчынае сэрца ведала, што яна нешчасьлівая, але заўсёдная устрыманасьць іх адносін не дазваляла ім шчыра гаварыць аб гэтым і яны рабілі выгляд быццам усё ідзець добра, так як належыць быць.—„Каханая маці! Чаму цяпер я не магу выказаць табе падзякі за ўсё, што ты зрабіла для мяне, чаму, як толькі я хацела бліжэй падыйсьці да твае душы, нейкі стыд абхопліваў мяне, чаму, калі я хацела да цябе прытуліцца і пацалаваць, нешта сковывала ўсе мае рухі. Паня Караліна цяжка ўздыхнула і быццам задрамала, але праз сон яна ўвесь час чула цяжкі хрып і нейкія пераліvы, што ішлі з грудзей хворай... Раптам вуха яе пачула нейкі незнаёмы гук, нешта шарпала паперу і білася аб сьцены... Вось толькі што было ў адным куце, а цяпер шарпаецца над галавой і ізноў паляцела ў працiўляжачы кут. Паня Караліна схапілася з канапкі; запаліла дрыжачымі рукамі сьвечку і ўвідзела нешта цёмнае і невялікае, што лётала пад стольлю, б'ючыся аб сьценкі. Спачатку ёй здавалася, што гэта быў верабей, пасьля яна ўспомніла, што ўначы птушкі сьпяць, перасунула сьвечку, прыглядзілася:. Гэта быў кажан. Нейкі страх пачаў расьці ў яе грудзёх. Гэта сьмерць. Нешта жудаснае, адвечнае, накапованае было ў махах крыльляў кажана. Ен круціўся, круціўся па пакоі, пасьля неяк павярнуўся, ціха вылецеў праз расчыненае вакно і скрыўся ў цямнеючых дрэвах. Паня Караліна скамянеўшы сядзела, а ў душы яе ўсё рос і рос страх і пэўнасьць, што гэта быў вястун сьмерці... Розум яшчэ хацеў вясьці барацьбу: „Ты-ж разумная, ці-ж можна даваць значаньня такім глупствам, такім забабонам. Ну, ўлящеў кажан і выляцеў. Ці можа мець такое малазначнае зьявішча ўплыў на хваробу?“ А сэрца плакала, стагнала: „Сьмерць, сьмерць, нічога цяпер не паможа.“

А. Залеўская.

1921 г. Вільня.

Бунт у Кіеве.

10 студня ўзбунтаваліся салдаты чырвонай украінскай арміі Да іх далучыліся работнікі і чыгуншчыкі. Бунтаўнікі захапілі кіеўск. арсэнал і ўсю сумежную частку места, а там і склады ўзрывучатых матар'ялаў на Лысай Гары. Паўстанцы рушылі к асяродку места, дзе адбыліся крывавыя спатычкі. Савецкая ўлада баранілася з помаччу войскаў, якія засталіся вернымі. У 7 гадзін вечара савецкія сілы пакінулі таварную станцыю і слабаду Дзяміноўку, якія зараз былі захоплены тутэйшымі паўстанцамі і грамадой сялян, 11-га студня раніцаю палажэньне было бяз зьмены. Камісары і вялікі лік савецкіх служачых паўцякалі ў Бахмач, дзе яны чакаюць падмогі, сьпешна высланай з Масквы. („В. С.“).

Бярдзічаў — Кіеў — Жытомір.

Прыезныя з Бярдзічава з пэўнасьцю падцьвярджаюць, што між Бярдзічавам і Кіевам няма зьвязку па зялезнай дарозе. Паўстанцы захапілі Кажанку і Фастаў. Праз Жытомір праехаць немагчыма, бо шосэ Жытомір—Кіеў перахвачана паўстанцамі атамана Мардалевіча. („В. С.“).

Правадыры украінцаў аб паўстаньні.

ПАРЫЖ, 24 студня (Ор.). У парыскай „Трыбуне“ зьмешчана гутарка з двума правадырамі ўкраінскіх паўстанцаў. Яны паведамілі, што ўся Украіна арганізавалася павайсковаму; паўстанчыя войскі разьбіты на дзьве групы ў ліку 150.000 чалавек; вайсковая дысцыпліна ў паўстанцаў надта суровая. Улада на Украіне запраўды ў руках паўстанцаў. Камісары жывуць у местах, як ў абляжэньні. Чыгункі таксама ў руках паўстанцаў. Эўропа памыляецца, што лічыць паўстанцаў а за разбойнікаў і драпежнікаў, бо гэта — патрыоты, якія змагаюцца за вызваленьне радзімы ад ворагаў.

Выезд літоўскай дэлегацыі у Маскву.

КОЎНЯ, 13 студня (Эльта). На днях у Маскву выяжджае літоўская камісія рэалізаваць мірную ўмову з Расеяю. Старшынёй камісіі В. Калнеціс.

„Аутаномная Беларусь“.

„Известия“ пішуць, як праходзіць раскладка хлеба ў Магілеўшчыне.

„Агентаў і паўнамоцнікаў забівалі з-за вугла бандыты, якіх прытулялі і хавалі сяляне—кулакі, бо глядзелі на іх як на сваіх абаронцаў ад раскладкі Бандыты дзеялі арганізована, выступаючы ад імя аўтаномнай Беларусі, нападалі на вол.-іспол.-комы, загадывалі ім пад страхам расстрэлу не прад'яўляць раскладкі да вёскі.

У Гарэцкім павеце прад. працаўніка Кошмана абабілі „сьмертным боем“ і загадалі выехаць з павету пад пагрозай расстрэлу.

Часам у вёсках ідуць бойкі ў поўным вайсковым значаньні гэтага слова.

У Быхаўскім павеце у часе боя на вуліцах вёскі пагінулі тры лепшых агенты: Раманаў, Цёмкін і Часьніцкі.

Многа і іншых ахвяр—забітых раненых і скалечаных на бяскроўным прадавольсьцьвеным фронце“

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Пятніца, 21-га студня 1921 г.

Анархісты. Швэйцарская фэдэрацыя анархістаў выдала маніфэст, у якім гаворыць, што ўсе існуючыя ўлады нічога ня варты і праводзіць ідэйную праграму анархізма (жыцьця бяз улады). Маніфэст паказывае на ўзрост анархічнага руху, які дабіваецца скасаваньня ўсякага ярма над асобай чалавека. Маніфэст зусім адкідае

сыянальных выгад. Самадзяржаўнасьць адмяніла магдэбурскае права і паступова зьніштожыла астаткі цэхавай арганізацыі.

У часе далучэньня Беларусі да Расеі (1793) у гарадох налічалася да 35 прац. „рукадзельнікаў“; усё гэта былі—рамесьнікі. Самадзельная прамысловасьць і рамёслы маюць значаньне на Беларусі да астатняга мамэнту.

Разам з імі ня ўміраець кляс рамесьнікаў, хоць ён прыкметна зьмяншаецца, як у краі разьвіваецца фабрычна-заводзкая прамысловасьць, а разам з ёю работніцкі кляс новай фармацыі. Агулам кажучы, фабрычна-заводзкая прамысловасьць на Беларусі разьвіта слаба. Прычыну гэтага трэба шукаць у тым, што ў Расеі і ў Польшчы рана стварыліся асобныя прамысловыя цэнтры, гдзе концэнтраваўся выраб і абмен. Аднак, на Беларусі шырока разьвіваліся і свае, галоўным чынам, гандлёвыя цэнтры, як Гомель, Магілеў, Менск, Вільня, Беласток і др. У цяперашні час у фабрычна-заводзкай прамысловасьці занята да 2 міліёнаў чалавек. Яны працуюць у браварох, на заводах піваварaных, маслабойных, ткацкіх, лесапільных, серчыкавых, шкляных, кафельных, цагельнях фарбярнях, а таксама на чыгунцы, у ціпа-літаграфіях, цінкаграфіях і інш.

Віднае месца займаець работніцкі кляс у лясных вырабах. Што год на лясных работах знаходзіцца, напрыклад, у Віцебскай губ. до 50 тысячаў у Магілеўскай 120 тысячаў, у Смаленскай 30 тысячаў, у Менскай 100 тысячаў, у Віленскай 40 тысячаў, у Горадзенскай 50 тысячаў чалавек. Але ўсё гэта пераважна сяляне—„адхожнікі“. Рыбалоўствам уva ўсім краі занята да 15 тысячаў чалавек гаспадароў і работнікаў. Шмат народу занята зьвераловствам, дабычаю вапны і да т. п.

Такім парадкам, работніцкі кляс на Беларусі разьвіт слаба і маець свае асаблівасьці. Ен рэзка розьніцца ад гарадзкога фабрычнага пралетарыята Расеі, які памяркоўна аднародзен, выпрацаваў сваё клясавае разуменьне. Ен не падобен да сельскага пралетарыята Нямеччыны, які выяўляець сабой стройную масу і забясьпечан культурнымі ўмовамі жыцьця. Ен надзвычайна разнародны па свайму складу, палажэньню гаспадаркі, ня меў іня маець вялікага значаньня ў грамадзкім жыцьці Беларусі.

3. Кляс служылай і працоўнай інтэлігенцыі.

Гэты кляс выдзяліўся з клясу шляхоцкага, калі беларуска-літоўскія князі і шляхта (зямяне) пачалі правільную гаспадарсьцьвеную арганізацыю. Гаспадарсьцьвена - адміністратыўнае будаўніцтва Беларуска - Літоўскага гаспадарства патрабавала цэлага раду мясцовых і цэнтральных служачых, як намесьнікі (у пасьледку ваяводы), цівуны (упасьледку дзяржаўцы) гараднічыя, войты, старасты, соцкія, дзесяцкія, пісары і г. д.

Беларусь у складзе Расейскай імпэрыі прыняла ўсё тое адміністратыўнае будаўніцтва, што і Цэнтральная Расея. На мясцах былі губэрнатары, паветавыя іспраўнікі, станавыя прыставы,ураднікі, у судзе—земскія начальнікі, валасныя судзьдзі; у сельскай валасьці—старшыні, пісары. Апрача таго, розныя ўстановы, як апека, управа, суд, розныя прысуцтвы (калектыўным ўстановы), школа, пошта, зялезная дорога, земства—мелі сваіх прадстаўнікоў гэтага кляса. Разбураны рэвалюцыяй адміністратывны механізм ня зьніштожыў кляса чыноўнікаў і служачых. Усе яны або прытарнаваліся к новым варункам, або часова асталіся бяз месца, ня умеючы ўзяцца за якую іншую працу.

Праваслаўная царква на Беларусі маець сваіх царкоўных чыноўнікаў: архірэяў, благачынных, духаўнікоў і г. д. Царква каталіцкая, жыдоўская і другія таксама маюць сваіх чыноўнікаў і духоўнікаў. Дзеля пастаяннага змаганьня двух цэркваў—праваслаўнай і каталіцкай духавенства хрысьціянскае не выўляець сабой цеснай клясавай групы. У адносінах правядзеньня хрысьціянства і аб'яднаньня каталікоў і праваслаўных, каталіцкая група гатова пайсьці на вунію з праваслаўным духавенствам.

Уся гэтая досыць значная група служачага кляса выявляець асобнага выгляду пралетарыят. Яго можна было-б далучыць да чароднага за ім кляса работнікаў, але ён маець сваю асобную псіхолёгію, сваю інтэлігентную веру і другую дарогу для дасяганьня пралетарскіх мэтаў і дзеля таго розьніцца ад кляса работнікаў. Самадзяржаўная палітыка ўвяла ў гэты кляс шмат расейскага элемэнта і прымусіла яго быць верным расейскай гаспадарсьцьвенасьці і нацыянальнасьці. І хоць беларускі элемент гэтага кляса таксама моцна абмаскаліўся, як апалячылася ў свой час беларуская шляхта, ён усё-ж у працэсе Вялікай рэвалюцыі і асабліва ў працэсе Беларускага адраджэньня паказаў беларускія самабытныя чырты, сумежныя з вялікім дэмакратызмам усяго беларускага народу. Тутака канечна патрэбна паказаць на новую фармацыю беларускай інтэлігенцыі.

Беларуская інтэлігенцыя новай фармацыі носіць пячаць сялянства: гэта тыя самыя сяляне, якія дасталі некаторую асьвету і узяліся за інтэлігентную працу,—вучыцялі, паштавікі, чыгуншчыкі, працаўнікі ў земствах і г. п. Шляхта з гістарычных часоў прывучыла сялян глядзець на ўсякую інтэлігенцію, як на паноў, і таму да рэвалюцыі 1905 г. і навет да рэвалюцыі 1917 г. беларуская інтэлігенцыя новай фармацыі ў свaёй культурнай працы ня мела падтрыманьня з боку сялянства і дзяржалася збоку. Пасьля 1905 году беларуская інтэлігенцыя пачала мець некаторае значаньне ў грамадзскіх і земскіх установах, а у 1917 годзе беспасрэдна ўвайшла ў рэвалюцыю, а потым—і ў беларускі нацыянальны рух.

(Працяг будзе).

парадак буржуазнага і савецкага капіталізма, кажучы, што капіталізм, у якой-бы форме ён ня быў, ёсьць страшэннае няшчасьце для людзей.

Ленін здароў. Савецкае пасольства ў Рызе паведамляе, што газэты зманілі, быццам Ленін цяжка захварэў.

Літва і Ліга Нацый. Ліга Нацый прыслала ўраду Літоўскай рэспублікі ноту, у якой пералічаюцца варункі плебісцыта ў Віленшчыне.

Францыя. Брыан сабраў новы кабінэт міністраў. Кабінэт пад яго старшынствам павядзе умеркаваную палітыку.

Індыя. Ня спыняюцца непарадкі, зробленыя бальшавіцкай прапагандай.

Венгрыя. У Будапешце рыхтуецца манархічны пераварот. Гарнізон, як кажуць, хоча абвесьціць вянгерскім каралём скінутага імпэратара Карла.

Субота, 22-га студня 1921 г.

Нота Чычэрына. Чычэрын прыслаў ураду Лацьвіі ноту, у якой зьняпраўджаець пагалоскі аб рыхтаваньні бальшавікоў напасьць на Лацьвію і вінаваціць у пашырэньні тых пагалосак Францыю.

Францыя. Новы францускі ўрад складаецца з 5 паступоўцаў, 17 прадстаўнікоў дэмокр.-рэсп. левай, 5 левых рэспубліканцаў, 2 сяброў радыкальной і радык.-соцыял. партыі.

В. Сілезія. Яўрэйскія камітэты у В. Сілезіі заклікаюць яўрэяў не галасаваць за далучэньне края к Польшчы.

Украінцы. *Ужгорад*, 15 студня (Р. П.). Хаўрус украінскіх настаўнікаў пастанавіў накладаць штраф грашмі на дзяцей у разьмеры 20 гелераў за кожнае сказанае імі вянгерскае слова.

Нядзеля, 23 студня 1921 г.

Расея. Камісарыят сельскае гаспадаркі склікае ў лютым усерасейскі зьезд аграномаў.

Украіна. У Варшаву прыбыла украінская дэлегацыя з-за фронта. Яна пратэстуе супроць самазваннага выступленьня бальшавікоў у Рызе ад імя украінскага народа. Дэлегацыя жаліцца, што бальшавікі з прынукаю мабілізуюць сыноў украінскага народа і высылаюць іх у Сібір і на Каўказ.

Турцыя і Грэцыя. Кемаль-паша ідзець на Сьмірну. Становішча грэкаў зусім благое.

Панядзелак, 24-га студня 1921 г.

Польшча і Францыя. Начальнік польскага гаспадарства Пілсудзкі выяжджае ў Парыж між 28 студня і 1 лютага.

Вільня і Ліга Народаў. Бліжэйшае пасяджаньне Лігі Народаў адбудзецца 21-га лютага (феўраля). Рада Лігі займецца пытаньнем аб плебісцыту ў Віленшчыне.

Францыя і Амэрыка. Францускі ўрад распачаў стараньні аб пазыцы ў Амэрыкі 100 мілёнаў доляраў.

Аўторак, 25 студня 1921 г.

Францыя. Новы старшыня міністраў Брыан сказаў праграму свае палітыкі. Ён будзе давадзіць разбраеньне Нямеччыны да канца і не пачне зносін з Расеяй, пакуль там бальшавікі. „Бальшавізм—чыста руская справа"—сказаў Брыан, і Францыя ўжо ня будзе лезьці ў унутраныя расейскія справы, але не дапусьціць, каб савецкая армія „пераступіла граніцы францускіх хаўрусьнікаў".

Японія і Амэрыка. Урад Амэр. Злучаных Штатаў паслаў рэзкую ноту Японіі з прычыны забойства ў Уладзівастоку японскім часавым амэрыканскага афіцэра.

Амэрыка і Маскоўшчына. Як пішуць газэты, палітыка Амэр. Злучаных Штатаў цяпер такая, што яны ня рыхтуюцца займацца адбудовай Расеі у старых граніцах і ня думаюць накідаць не—маскоўскім тэрыторыям панаваньне Маскоўшчыны.

Сярод белых. Казацкі полк арміі Врангеля, які знаходзіцца ў Чаталджы, узбунтаваўся і адабраў аружжа ў сваіх афіцэраў. Пакаралі паўстанцаў францускія войскі. Есьць забітыя і раненыя.

Серада, 26-га студня 1921 г.

Ірляндыя. Змаганьне ірляндцаў за незалежнасьць бацькаўшчыны ад Англіі ня спыняецца. У Дублін прыбываюць новыя транспарты ангельскіх войскаў, артылерыі і амуніцыі. Уважаюць, што ў канцы месяца там будзе абвешчан стан абляжэньня. Газэты паведамляюць, што сінфэйнеры (ірляндзкія незалежнікі) рыхтаваліся падпаліць у Лёндыне адзін вялікі урадовы будынак і склады газы (красіны).

Расея і Грузія. Грузінская місія ў Парыжы дастала вестку, што бальшавікі сабралі шмат войска на грузінскай граніцы. Місіі даручана прасіць Антанту, каб яна дапамагла Грузіі бараніцца ад Расеі. Прадстаўнік расейскі ўжо выехаў з Тыфліса.

Чацьвер, 27-га студня 1921 г.

Італія. Нарада італьянскіх соцыялістаў у Ліворна закончылася падзелам партыі на камуністаў і не-камуністаў. Камуністы арганізуюць самастойную партыю.

Швейцарыя і Лацьвія. Урад Лацьвіі даставў афіцыяльную прапанову ад аднаго швейцарскага акцыянэрнага таварыства на эксплоатацыю латыскіх лясоў. Таварыства зараз пускаець у гэтую справу 25 мілёнаў швейцарскіх франкаў.

Расея. Адбыліся вялікія ўрачыстасьці на ўгодкі 9-га студня. На лекцыях разглядалі роль Гапона ў паходзе народа к Зімняму Дварцу.

Літоўская рэспубліка. У Коўні надта падзешавелі тавары: цукер, газа, мыла і інш., бо дужа многа тавараў панавезьлі загранічныя купцы.

Як паведамляюць з Варшавы, зноў выпусьціў да беларускага народа праклямацыю генерал Балаховіч.

Можна спадзявацца, што ўсе палякуючыя беларускія нацыяналісты ўрэшце зьбягуцца к яму.

✓ Грэшная чарнушка.

Зараз пасьля Каляд, у ціхі засыпаны сьнегам дзень, зьезьдзілі на дзярэўні дзьве чарнушкі і зьбіралі на свой намастыр каляду. Адна, маладзейшая, заставалася на дварэ пры санях з дабром, а другая, старэйшая, хадзіла па хатах. Увойдзе, пачне хрысьціцца, ды кланяцца, ды божкаць, перабярэць па йменьню ўсіх сьвятых угоднікаў, спамянець Афон і Кіеў, а ўрэшце глядзіць спадлоба бяльматымі і тупымі вачыма, чакаець, чым будзе гаспадыня даравацъ. Стаіць у парозе ўся ў чорным, падаткнуўшы полы ў сьвіты. Ногі, як у салдата, ў вялікіх ботах, рукі вялікія, мужчынскія, ад працы закарэлыя, ад сьцюжы чырвоныя, каб згарнуць, то і кулак быў-бы салдацкі. Твар зрыты воспаю, курносы. На грудзёх—дзеравяны абраз, а на баку—торба.

Заехалі тыя чарнушкі начаваць да аднаго заможнага гаспадара, які раней быў старастам царкоўным і шмат нацягаў сабе старых абразоў, як рабілі ў царкве рамонт. У яго было дзьве хаты і абедзьве ён тапіў скрозь усю зіму, бо ў адной сам жыў, а ў другой веселі тыя абразы. Баўся, каб у сырасьці не пакарбаціліся. Абразы былі вялізныя; іншыя такі высокі, што ад зямлі да самае столі. Былі і меншыя. Адна бяда, што ўсё найбалей Госпады-Савафы—вялікія і маленькія, а другіх азабражэньняў было мала: пары са дзьве прарока Ільлі, таксама троху падобнага з сваім воранам да Саваофа з галубком, адзін абраз Кірылы і Мяфода,—вось і ўсё. Багародзіцы ніводнай ня было. У гэтай хаце склалі чарнушкі свае зборы і заначавалі. Маладзейшай карціла пайці ў другую хату, адкулецька чуваць былі гоман і галасы маладых сыноў гаспадара. А старэйшая пільнавала за таварышкай, загадала завесіць адно ня зусім замёрлае вакно хвартухом, замест фіранкі, і зараз паставіла яе з сабою на малітву.

Страшэнна ўпадабала яна маліцца на гэтыя старасьвецкія абразы. Маладзейшая заміналася, што няма нідзе сьвятой, прачыстай Багародзіцы, але старэйшай тое, што было гэтулькі Саваофаў, надта падабала. І вось залезла ёй у галаву нядобрая думка: украсьці адзін абраз саваофаў і завезьці да сябе ў намастыр. Нічога ня сказаўшы той, як толькі ўсе пакладліся ўжо спаць, яна ціхенька ўстала, зьняла сярэдні па вольнасьці Саваофаў абраз і панясла на двор хаваць у свае сані пад пяхцер. Іпла, малілася, каб не зламілі на зладзействе, дрыжэла, каб дужа ня рыпнуць, выходзячы, дзьвярмі... Але як толькі нахінулася над сенам, рыпнулі зноў паціхеньку дзьверы і вышаў нейкі мужчына, гэта быў гаспадароў дзяцюк у валенках і кажусе. Ён вышаў дасачыць, каторая і ча' тут ходзіць. „Бедная,—падумаў ён з жаласьцю пра маладую манашку;—губіць сваё маладое жыцьцё з сумам, ніхто яе не пажалеесь, не пажартуець з ёю". Ня мог разгледзіць, што ня тая і схапіў за плечы.

— А, дзядзечка,—ледва прашапацела перапуханая зладзейка;—ня буду болей век,—хацела вымавіць яшчэ, але і дух ёй заняло ад нязвычайнай прыкрасьці перад старым гаспадаром.

— Ага, ты абразы псуеш!—грозна зашаптаў на вуха чалавек,—вось я старавому дакажу, сашлюць абедзьвюх у Сыбір.

— Яна невінавата... — задыхалася чарнушка пад яго цёплым кажухом,— гэта я адна надумалася...

Разгледзіўшысь, што, мусіць, не стары, а яго сярэдні ці меншы сын, яна сьмялей, хоць і не бяз страху, пусьцілася на выкрутасы:— Рабі, браток, што хочаш... толькі-ж маўчы.

Як пачуў дзяцюк, што гэтак просіць, аж затрасло яго ад спужаньня. Пераварнуў-такі за плечы да сябе і як убачыў скрозь цямноту знаёмае на носе рабаценьне, так страшэнна засароміўся, што кумільгам скаціўся з саней і пабег бяз гуку ў валенках у хату.

Чарнушка занясла абраз назад на сьценку, бардзяй паклалася ад трасцы, а назаўтра яны да сьвету паехалі з двара.

М. Гарэцкі.

10.XII—20.

Дрэнная доля.

Кажуць людзі, што кожны чалавек родзіцца пад асобай зоркай, што гэта зорка пры яго нараджэньні ўжо паказвае яго долю. Калі-б дзіця, першы раз зірнуўшы на сьвет Божы магло ўбачыць і зразумець ракавую зорку,—умерла-бы ў тую мінуту; але таемніца жыцьця яго захавана, і яно расьце. У курнай хатцы бедных бацькоў родзіцца хлопчык. Не дасыпаець ночы галодная маці, гадуе свайго роднага сына. Нагнуўшыся нэд калыскай свайго сына, ня раз думала пра яго лёс. І хочацца ёй, каб яе сын меў лепшую долю, каб ён быў ўцеха бацькоў. Гады ідуць, а разам з імі падрастае хлопчык Васіль. Бачыць ён, як дзеці бягуць ў школу і просіць бацькоў вучыць. Добрыя парыбаньні дзіцяці спаткалі ў бацькоўскім сэрцы гарачы адзыў. Вучыцца хлопчык. Зацікавіўся ён навукаю і паставіў сабе мэту—вывучыцца настаўнікам. Але цяжкія варункі часова спыніваюць яго навуку. Школа пачатковая не дала яму таго задавальненьня, якога жадала яго душа. Тры гады цяжка працуе ён на свае гаспадарцы. Але душа яго рвецца да вышэйшай працы. І вось зьяўляецца магчымасьць вучыцца далей. Ён ідзе ў батракі да заможнага гаспадара, робіць з ім умову, каб мець магчымасьць вучыцца ў вучыцельскай школе,— ня ў вучэньня нясе фізічную працу. Прахадзяць чатыры гады яго цяжкай працы, і ён выходзіць вучыцелем. Споўнілася яго шчырае жаданьне, і ён перажывае залатую пару. З вялікім жарам прымаецца ён за вучыцельскую працу, прыцягвае сымпатыі дзяцей і бацькоў. Вайна разьбіла яго шчасьце. Тры гады з паловай прабывае ў вайсковай канцыляры,—душэўна мучыцца, што яго праца бяз'ідэйная. Год з паловай пракуе ў Расеі у бежанскім аддзеле і наканец пападае на бацькаўшчыну. Ён хоча ўзнавіць сваю вучыцельскую працу на сваёй нацыянальнай ніве, але пападае ў цяжкія варункі. Ён пакідае сваю родную вёску і бяжыць да сваіх братоў, якія жывуць трохі ў лепшых варунках. Але там ён знаходзіць халодны камень, яго прымаюць за чужынца. Гэта ён цяжка адчувае на свайм сэрцы. Звалівае ўсе няўдачы на сваю няшчасную долю,—памірае.

В. Гулько.

13/I—1921 г.

■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■ ■

З Беларускага жыцьця.

Вываз з Беларусі.

Ангельскія, францускія і нямецкія гандлёвыя фірмы апошні час робяць прапазыцыі коопэратыўным арганізацыям аб дастаўцы ў Вільню розных тавараў. Дзеля таго што, апрача Польшчы, усе граніцы зачынены і прывязьці ў гэты час тавары няма магчымасьці, чужаземцы прапануюць зрабіць з імі ўмовы і даюць грошы каб купіць для іх розных тавараў у Беларусі. Коопэратывы ад такіх зьдзелак пакуль што ўстрымліваюцца.

У Сьвіранках (Сьвянцянскага пав.) існавала дзіця Стражы Крэсовай Ральніча-Гандлёвае Таварыства з капіталам... у 4000 мар. Аб коопэрацыі з ураду ніхто нічога ня ведае. Спачатку ўвесь скарб коопэратыва абабралі легіянэры, а пасьля казакі. Сяброў было каля 80 з паямі ў 25 мар. Урад усім вярнуў паі і дзеля гэтага цяпер ахвотна закладаецца новае таварыства.

У Ашмянах гр. Фэйгін арганізаваў сялянска - гаспадарчы вытворчы коопэратыў. Запісалася сябрамі 35 асоб. Хочуць абрабляць сваімі сіламі агарод у 8—10 дзесяцін. Мэта коопэратыва прыцягнуць яўрэяў к земляробству. Дапамогу коопэратыву дае яўрэйская арганізацыя „Орт" у ліку 200.000 марак.

У Жэлядзі існавала нешта падобнае да коопэратыўнага таварыства. З мовы з селядзем высьвятляецца, што таварыства перастала існаваць дзеля таго, што урад папаўны павяліўчыць сяброўскія паі. Іншыя гаворачы, што непаразуменні паміж сяброў ураду пачаліся з-за няправільнага ходу справ і спэкуляцыі некаторых асоб, якія, уклаў-

Будслауе Вялейскага пав.

Гэта мястэчка і ўся ваколіца тутэйшая нядаўна была прыгожым месцам. Мястэчка пачало цьвісьці, была адчынена гімназія... Наагул наша ваколіца дала многа працаўнікоў бацькаўшчыне, людзей-патрыотаў, стала вядомым месцам чуць ня ўсей Беларусі.

Цяпер гэта мястэчка і ўсе вёсачкі, якіх спаткала роўная бяда-вайна—мёртвыя. Гэта мясцовасьць нядаўна жывая, шчасьлівая, абярнулася ў бедную, маркотную, няшчасную.

Барунскі коопэратыў.

Прадстаўнікі барунскага коопэратыва зьвярнуліся да ашмянскага старасты па дазвол на прыьоз солі для коопэратыву. Стараста адмовіў пад тэй прычынай, што для коопэратыва ўжо ўзяў дазвол і прывёз два вагоны солі пан Волністы. Выясьнілася, што пан Волністы ніякага даручэньня ад коопэратыва ня меў, а прывезеную соль прадаў сялянам па спэкулятыўнай цане.

Закрыцьце беларускай газэты.

У Горадні зачынена газэта „Беларускае Слова". Беларускі нацыянальны камітэт распушчан, некалькі асоб арыштавана.

Беларуская вуч. сэмінарыя.

Беларускі аддзел дэпартамэнту асьветы назначыу дырэктарам арганізуемай беларускай вучыцельскай сэмінарыі вядомага беларускага дзеяча і педагога Сымона Рака-Міхайлоускага.

У беларускім клюбе.

У суботу 22 студня, у беларускім клюбе адбылася дабрачынная вечарынка з канцэртным аддзелам. Славянскі хор прапяяу цэлы рад песьняу на беларускай, украінскай і польскай мове. Публіка была надта задаволена і дружна плескала хору.

Афяра.

Генерал Жэлігоускі прыслау на віленскі беларускі прытулак 5.000 польскіх марак.

Тутэйшае жыцьце.

У Амэрыканскім камітэце помачы дзяцем м. Вільні.

Пасьля таго, як прысланая вопратка была раскладзена паштучна і пералічана, выявілася, што замест 3000 камлектаў ёсьць толькі 2600 цэлых камплектаў. У камплект уваходзіць: пальто, боцікі і панчохі. Пальто ёсьць 2600, боцікаў 2869 пар і панчох 2638 пар і, апрача гэтага, ад пальто засталіся, ня лічачы раскладзеных па камплектах 2600 пальто, яшчэ разрозьненыя рукавы, полы перадоў і г. д. Увесь лік рэчаў, што перавышае 2600, будзе пакуль што затрыманы у Камітэце на усялякі выпадак, калі помач дзіцёнку патрабуецца пасьпешна і можа такому, што і не зарэгістраваны у Камітэце. На пасяджэньні камітэту прынята пастанова, што Камітэт дае вопратку толькі тым дзяцём, якіх ён корміць і, апрача таго, толькі тым, што значыліся у сьпісах у сьнежні прошлага году. Водле гэтых сьпісаў хрысьціянскіх дзяцей 10.050, жыдоўскіх 6914, а разам 16.964 дзяцей, а камплектаў толькі 2600 то, з гэтага выходзіць, што толькі ледва чацьвертая частка усіх дзяцей можа быць апранена. Прыймаючы пад увагу, што у прошлым годзе некаторыя закрытыя інстытуцыі аж па два разы атрымалі шмат рэчаў ад Амэрыканскага чырвонага крыжа, а так сама што школы, ня гледзячы на тое, што іх ня раз папяражалі, каб яны намяшчалі у сьпісы дзяцей толькі найбольш патрабуючых, падалі сьпісы усіх дзяцей, якія атрымліваюць дакармленьне. Можна думаць, што запраўдная бедната нашага места будзе агледжана праз гэты дар Амэрыкі. Дзеці будуць самі атрымліваць спачатку пальто, а пасьля праз некалькі дзён, як прыйдзе у спашытым, тады датрымае боцікі і панчохі. Гэткім чынам сябры Ам. Кам. Пом. Дз. спадзяюцца спыніць уселякія надужыцьці, каб назначаным і аддадзеным пэўнаму дзіцёнку не скарыстаўся хто іншы.

А. З—я.

Жыды адмаўляюцца ад выбараў у Сойм.

У Варшаўскіх газэтах зьявіліся весткі, што сярод тутэйшага жыдоускага насяленьня зрабіуся раскол, што частка жыдоу будзець галасаваць пры выбарах у Сойм, наўпрэкі пастанове жыдоускага кагалу. Асоба, добра ведаючая тутэйшае жыдоускае грамадзкае жыцьце катэгорычна зьняпрауджвае гэткія чуткі і ня прыдаець прынцыповага значэньня згодзе 5 х кандыдатау-жыдоу паставіць свае фаміліі у сьпіску „Работніцкай групы".

Аб палякох якія служылі у Пятлюры і Перамыкіна.

ВАРШАВА, 19 ст. (Ор). Міністр вайсковых спрау Сасноускі выдау распараджэньне, на моцы якога палякі у лагерах для інтэрнаваных, што служылі у Пятлюры і Перамыкіна, могуць дамагацца свайго асвабаджэньня.

Праваслаўны прытулак.

Пры Віленскім праваслаўным камітэце, у будынку Сьв. Духава манастыра, знаходзіцца прытулак на сорак дзяцей. Некалькі месяцау назад матэр'яльнае палажэньне прытулку было жудаснае: ня было ні грошы ні прадуктау.

Цяпер, дзякуючы цяжкай і стараннай працы загадчыц прытулкам М. С. Еудакімавай і Г. А. Валк, становішча прытулка палепшылася.

Некаторыя з дзяцей вучацца у малодшых клясах Беларускай гімназіі.

Шкада толькі, што няхват грошы не дае магчымасьці купляць для большых дзяцей патрэбныя школьныя падручнікі, а для меншых цацкі і. калі грамадзяне не адмовяцца ахвяраваць непатрэбныя ім кніжкі і цацкі, усе будзе прынята з падзякаю,

Пэнсія вучыцялём пачатковых школ.

Вучыцялі пачатковых школ будуць даставаць пэнсыю па акладу роўнай ім катэгорыі супрацоўнікаў урадовых устаноў.

Суд.

У віленскім вайсковым судзе, 25 студня, пачалася разьбірацца справа 10 тэрорыстаў: Вейсбаха, Башкірава, Захарава, Корсакава, Бачкова, Зеленкова, Закгейма, Сьвечнікава, Ганяева, Струсач і Голуба, якіх абвінавачваюць у тым, што яны вялі агітацыю на карысьць саветаў, хавалі ўзрыўчатыя матэр'ялы, зьбіраліся рабіць замах на жыцьцё ген. Жэлігоўскага, Балаховіча, Савінкава і хацелі перавярнуць гаспадарсьцьвены строй у Польшчы і Сярэдняй Ліцьве.

Абвінавачаныя называюць сябе сябрамі партыі расейскіх с.-р. і адракаюцца ад адвінавачаньня у тэроры.

Цэны на хлеб.

Фунт чорнага хлеба прадаваўся ўчора не дзешавей за 26 марак.

Віленская біржа (гальда).

Царскія 500	550
„ 100	500
„ 10 і 25 (за 100)	430
„ 5 „	290
„ 3 „	230
Думскія 1000 . . .	95
„ 250 . . .	75
Нямецкія маркі. . .	1375
Ост-маркі	1360
Золата 10 р. . . .	4000—4100
Серабро (1 р. і 50 к.)	220
„ дробнае . .	90

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны грамадзянін Рэдактар!

Будзьце ласкавы надрукаваць у газэце „Наша Думка" ніжэйпісанае.

У 12 вярстох ля Вільні ёсьць былы пекны зялезнадарожны пасёлак Рэйслерава.

Ен павінен ужо даўно зьвярнуць увагу ўлады сваім зруйнаваньнем, аднак гэтага яшчэ ня здарылася, а тым часам рэшта шкілетаў-хат расьцягаваецца далей, пасяліўшыміся там падазрыцельнымі асобамі, якія нічым не займаюцца і прыехалі Бог ведае адкуль. Яны разьбіраюць астаткі печаў, сьцен, здымаюць чарапіцу, і ўсё гэта прадаецца прыяжджаючым падвіленчукам па вельмі нізкай цане, абы зарабіць.

Чатыры каланісты, пражываючыя там, усімі сіламі стараюцца абараніць руіны да павароту сваіх сяброў-бежанцаў з Расеі, але, як людзі занятыя, ня могуць усьцерагчы, а зладзействы ўсё шырыцца і шырыцца.

Як памагчы бядзе ў данным выпадку, цяжка і прыдумаць. Маем надзею, што ўлада ўсё-ж-ткі зьверне увагу на астаткі калісьці пекнай калёніі і спыніць самавольства.

Рэйсляровец.

22 студня 1921 г.
Вільня.

Паштовая скрынка.

В. СТАЛЯРОНКУ. Ваш верш „Нашым апякуном" ня увідзеу сьвету па незалежнай ад нас прычыне. „Дзяліцьбітом Беларусі", уважаючы на тое, пакуль што ня друкуем. Вельмі просім прысылаць яшчэ вершы і допісы аб жыцьці на весцы.

ІНФОРМАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ.

Бібліятэка Беларускага Навуковага Т-ва будзе адчынена дзеля карыстаньня на месцы для навуковых мэт у памяшчэньні Т-ва пры Вострабрамскай вул. № 9.

Беларускае Выдавецкае Т-ва выдае ўсялякія кніжкі ў беларускай мове. Сябраў прынімае Урад Т-ва. Уступная плата — 50 м., сяброўская гадавая складка — 100 м. Адрэс Т-ва: Віленская вул. № 33, кв. 1 (адчынена ад 4 да 5 гадз. у дзень).

Бібліятэка б. „Знаніе" мае багаты выбар кніжак да чытаньня ў розных мовах. Адчынена: 10—1 і 3—6 гадз. Адрэс: Віленская 33.

Беларуская Кнігарня „Беларускага Выдавецкага Т-ва" мае на прадажы ўсе беларускія кніжкі. Адрэс: Завальная 7.

Беларускі Нацыянальны Камітэт месьціцца ў Вільні, Вострабрамская, 9, пакой № 5. Старшыня Ф. Ярэміч, Робіцца рэгістрацыя беларусаў і даецца духоўная і матар'яльная помач.

1-я Віленская Беларуская Гімназія месьціцца на Вострабрамскай вул., 9. Дырэктар М. Кахановіч, інспэктар А. Дмахоўскі.

Беларускія пачатковыя школы ў Вільні. 1) Кальварыйская, 73; 2) Лідзкі тракт, могільнік; 3) Радунская, 27-а; 4) Зарэчча, Панамарская, 12. Навука бясплатная. У кожнай школе даецца дзяцём сьнеданьне.

Беларускі Школьны Аддзел. Вільня, Каўкаская вуліца (рог Вялікай Пагулянкі), 2, другі паверх, налева, пакой № 13.

Беларускі Вучыцельскі Саюз Канцэл. 1-й Віленскай Беларускай Гімн.

Прытулак Камітэта Помачы. Вострабрамская, 9 (будынак гімназіі). Загадчыца Л. Васілевіч.

Віленскі Саюз Коопэратываў Малая Погулянка, дом № 12

Коопэратыў „Райніца" ў Вільні. Вялікая Пагулянка, 17.

Коопэратыўная друкарня „Друк", Вільня, Вострабрамская, 5 (Пасаж). Там-жа Беларускае Выдавецтва У. Знамяроўскага.

Беларускі Клюб ў Вільні. Біскупская, 12.

Літоўская паліклініка. (Віленская вул. проці Дабрачын. зав.) прыймае хворых ў аддзяленьнях: хірургічных хвароб, унутраных, на вочы, акушэрства і гінеколёгіі. Пользу даюць адмыслоўцы за самую невялічкую плату.

Дазволена Ваеннаю Цэнзураю. Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ Кооп. Друкарня „ДРУК", Вострабрамская 5.